ISSN 0023—3102

# Беларуская ДУМКА

## Белорусская мысль

12
2004



*Заснавальнік*

**АДМІНІСТРАЦЫЯ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**




Выдаецца з кастрычніка 1991 г.

**12**
снежань

**ШТОМЕСЯЧНЫ НАВУКОВА-ТЭАРЭТЫЧНЫ І ГРАМАДСКА-ПУБЛІЦЫСТЫЧНЫ ЧАСОПІС**

У НУМАРЫ:


| | | |
|---|---|---|
| | *Час информации*<br>**Величко В.** Путь, который называется жизнью | 3 |
| | **Шырко В.** У Лельчыцах, дзе сэрцы лечацца | 10 |
| ***УЛАДА*** | **Вербовиков О.** Наш паровоз вперед летит и... наступает на грабли | 20 |
| | **Азаматов Н.** Оборонка сосредоточивается | 24 |
| | **Соколовский А.** Торговля начинается с выставки | 31 |
| ***ЭКАНОМІКА*** | **Клицунова В.** Туризм с приставкой «агро» | 35 |
| ***ЭЎРЫКА!*** | По страницам зарубежных журналов | 41 |
| ***ФІЛАСОФІЯ І СУЧАСНАСЦЬ*** | **Федотов А.** Тревога мира | 46 |
| ***АСОБА*** | **Локун В.** Празаік эпічнага таленту | 54 |
| | **Абламейко С., Орешко Т.** Реальность, воплощенная в образе | 62 |
| ***НАВУКА І ТЭХНАЛОГІІ*** | **Жебит Г., Рыбка Д., Сташкевич О., Барабанов К.** Элита в новом измерении | 67 |
| ***АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ*** | **Батура М., Булыка Г.** ...Плюс информатизация всей страны | 71 |
| | **Карнажицкая Т.** Штрихи к портрету студенчества | 76 |
| | **Левко А.** Где обитает возвышенное? | 81 |
| ***ДУХОЎНАСЦЬ*** | **Николаева Л.** Фотолетопись Петра Костромы | 88 |
| ***СОЦЫУМ: РАКУРСЫ І ГРАНІ*** | **Яковлева Т.** ...А туи будут расти | 92 |
| | **Шелехов М.** 1. Колокол на березе | 97 |
| | **Чубат А.** 2. В поисках второй родины | 106 |
| ***ПРАВА*** | **Жывіца В.** Да пары збан ваду носіць | 110 |
| ***МОМАНТ ІСЦІНЫ*** | **Леонов Н.** Ни щита, ни меча | 117 |
| ***ГІСТАРЫЧНАЯ ПАМЯЦЬ*** | **Марціновіч А.** Птушка, якая першай да Кітая даляцела | 122 |
| ***ПЛАНЕТА І МЫ*** | **Малашук П.** Сербы и сябры: прошлое и настоящее | 130 |
| ***ЛІТАРАТУРА І ЖЫЦЦЁ*** | **Мятліцкі М.** З Радзімай навечна павязаны мы... *Вершы* | 138 |
| | **Зэкаў А.** Водгук далёкага кахання. *Апавяданне* | 142 |




Установа ... бібліятэка ...

| | | |
|---|---|---|
| *СВЕТ МАСТАЦТВА* | **Ярмалінская В.** Агні малой сцэны | 147 |
| *СПОРТ І ЗДАРОЎЕ* | **Ломсадзе Л.** Радиация, опалившая наши судьбы | 153 |
| | **Лісоўскі С.** Трамплін у актыўнае жыццё | 162 |
| *ЭКАЛОГІЯ* | **Белоокая М., Жигалко В.:** «У нас должно быть высокое чувство осознания себя белорусами» | 167 |
| | **Пациенко Г.** *Этюды* | 172 |
| | **Стома В.** Рыбе патрэбна дапамога | 176 |
| *ПОШТА* | **Корнелюк К.** Не остуди свое сердце!.. | 178 |
| | **Титов В.** Родословная семьи | 179 |
| | **Мартинович Д.** Как прекрасен этот миг! | 180 |
| | Академия веселых наук | 182 |
| | **Козырева Л.** Петух всех разбудит | 183 |
| | Указатель статей, помещенных в журнале «Беларуская думка» в 2004 г. | 186 |

Галоўны рэдактар У. П. ВЯЛІЧКА

*Рэдакцыйная калегія:*
У. П. Андрэйчанка, С. П. Вінакурава, С. Н. Князеў, А. А. Марціновіч, Г. А. Махнач, М. У. Мясніковіч, А. В. Праляскоўскі, С. В. Рашэтнікаў, У. В. Русакевіч, М. С. Сташкевіч, І. А. Чарота, У. М. Шымаў, М. М. Шэлехаў, Л. М. Якавенка

*Тэлефоны рэдакцыі:*

галоўнага рэдактара — 232-13-24; першага намесніка галоўнага рэдактара — 232-13-36; намесніка галоўнага рэдактара — 287-16-54; прыёмнай — 232-12-94;

*аддзелаў:* філасофіі, гісторыі і міжнароднага жыцця — 287-16-54; дзяржаўнага будаўніцтва — 287-18-91; эканомікі — 287-19-88; навукі і тэхналогій — 287-18-91; экалогіі і медыцыны — 287-15-82; сацыяльных праблем і права — 287-15-82; адукацыі і маралі — 287-19-88; літаратуры і мастацтва — 232-13-36; мастацкага афармлення — 287-18-91; карэктарскай — 287-17-65; бухгалтэрыі — 287-17-88; факс — 287-17-88. E-mail:beldumka@telecom.by.

Часопіс выходзіць на беларускай і рускай мовах у залежнасці ад мовы аўтарскага арыгінала. Аўтары апублікаваных матэрыялаў у адпаведнасці з Законам аб друку нясуць адказнасць за дакладнасць прыведзеных фактаў і звестак. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара. Рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Перадрукоўванне дазваляецца па ўзгадненню з рэдакцыяй, спасылка на часопіс «Беларуская думка» абавязковая.

Мастацкі рэдактар Н. Ф. Альхоўская
Тэхнічны рэдактар Н. Я. Гарбар
Карэктары: Р. І. Акшэўская, Т. Ф. Архіпенка, Л. П. Жыткавец

Падпісана да друку 29.11.2004
Фармат 70х108 1/16. Афсетны друк. Гарнітура Таймс. Папера афсетная
Умоўна-друк. арк. 16,8. Умоўн. фарбаадб. 17,2. Ул.-выд. арк. 20
Тыраж 5459 экз. Заказ 2935. Цана ў розніцу — 1500 руб.

*Адрас рэдакцыі:* 220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
220013, Мінск, праспект Францішка Скарыны, 79.

© «Беларуская думка», 2004

АСОБА





Іван ЧЫГРЫНАЎ.

**Валянціна ЛОКУН**
Кандыдат філалагічных навук

Пінск

# Празаік эпічнага таленту

Ён належаў да «філалагічнага» пакалення, да «дзяцей вайны», якое зведала жахі нямецка-фашысцкай акупацыі, пасляваенныя цяжкасці. Жыццёвы вопыт гэтага пакалення дазволіў ім першымі сказаць пра трагедыю вайны «без фронту», пра знішчэнне вёсак разам з людзьмі, пра галоднае дзяцінства. «А галодныя мы,— прызнаваўся пісьменнік,— здаецца, былі заўсёды: то харчу не хапала, то солі (не пасаліўшы — не з'ясі), то яшчэ якой трасцы... Як заходзіў год за год, так і голад за голадам ішоў»[1].

Распачалі тэму «дзяцей вайны» Б. Сачанка («Апошнія і першыя» — 1966) і І. Пташнікаў («Тартак» — 1967). Пасля да іх далучацца А. Адамовіч, В. Адамчык, М. Стральцоў, В. Казько... У кантэксце гэтай літаратуры пачынаў свой творчы шлях і І. Чыгрынаў. Яго апавяданне «Бульба» стала адметнай з'явай у развіцці беларускай ваеннай прозы 60-х гадоў.

Проза І. Чыгрынава вызначалася асаблівай маштабнасцю адлюстравання падзей, глыбінёй разумення ўнутранага жыцця чалавека — чалавека на вайне, чалавека, які прайшоў выпрабаванні вайною. Пісьменнік «даследаваў чалавека ў руху гісторыі» (Ю. Бондараў). Як даследавалі яго, чалавека, класіка беларускай літаратуры, пісьменнікі эпічнага накірунку М. Гарэцкі, Я. Колас, К. Чорны, І. Мележ.

## Творы нараджаліся «з жыцця»

Нарадзіўся народны пісьменнік Беларусі І. Чыгрынаў 21 снежня 1934 г. у вёсцы Вялікі Бор Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці. Вучыўся ў Саматэвіцкай сярэдняй школе, там, дзе ў свой час вучыўся і А. Куляшоў. У 1957 г. скончыў аддзя-

ленне журналістыкі Белдзяржуніверсітэта. Працаваў у выдавецтве АН БССР (1957—1965), у рэдакцыі часопіса «Полымя» (1965—1975), быў сакратаром праўлення СП БССР (1976—1986), старшынёй Беларускага фонду культуры (1987—1996) і з 1989 года — адначасова галоўным рэдактарам часопіса «Спадчына».



З Іванам ПТАШНІКАВЫМ, Уладзімірам ДАМАШКЕВІЧАМ, Барысам САЧАНКАМ. 1969.

Творы І. Чыгрынава нараджаліся «з жыцця», з асабіста перажытага, пачутага, а яшчэ з дакументаў, з рэальных фактаў. Разам з тым першыя ўжо зборнікі яго «малой прозы» «Птушкі ляцяць на волю» (1965), «Самы шчаслівы чалавек» (1967) засведчылі пра тое, што ў літаратуру прыйшоў празаік з эпічным светаадчуваннем. Суб'ектыўнасць, лірызацыя апавядання мелі больш фармальны, знешні характар (частыя звароты да я-формы, замалёўкі прыроды і г. д.).

Унутрана пісьменнік імкнуўся да аб'ектыўнасці, канкрэтнай побытавай дэталі, стрыманага руху, спакойнай інтанацыі: «Ігнат скідаў за дваром апошнюю капу сена і, разгарачаны, увайшоў у сенцы, пастаяў там, пакуль не звыкліся вочы з лёгкім змрокам, і толькі пасля ўжо ўзяўся за конаўку, што вісела на сцяне над лаўкай, на якой стаялі вёдры з вадой. Вада ў адным вядры была халодная — мусіць, нядаўна з крыніцы, і зубы Ігнатавы адразу зайшліся. Ён пачаў піць маленькімі глыткамі. Піў доўга, смакуючы, і ўвесь час адчуваў, як паступова астывала нутро»,— так пачынаецца апавяданне «Ішоў на вайну чалавек».

Іван Чыгрынаў імкнецца да унікальнасці праз падкрэслена будзённае, празаічнае. Ідзе вайна, чалавек збіраецца на фронт, туды, дзе смерць. Але для героя апавядання вайна ёсць справа не выключная, а звычайная. Для Ігната вайна перш за ўсё праца, цяжкая, звязаная з вялікай рызыкай для жыцця, але праца. Пра смерць герой не думае, ён увесь у мірных клопатах — пра сям'ю, пра справы вясковыя. За гэтымі паводзінамі ўгадваецца вялікая ўнутраная сіла героя, які нібы Антэй жывіцца сокамі сваёй зямлі.

Героі апавяданняў І. Чыгрынава — амаль ці не заўсёды вясковыя людзі. Яны навек параднілісяз зямлёй, з нялёгкай сялянскай працай, з навакольнай прыродай. Яны сталі неад'емнай часткай прыроды. Гэтыя простыя сяляне з'яўляюцца носьбітамі найвысокіх маральных і духоўных каштоўнасцей. Усе яны дарагія пісьменніку, бо і ён сам быў таксама «селянін па паходжанню, селянін па душы»[2].

Духоўная блізкасць аўтара і яго персанажаў праяўляецца і ў частым выкарыстанні «я-формы». Герой-апавядальнік у «малой прозе» І. Чыгрынава — перш за ўсё падарожнік. Ён вандруе па роднай зямлі, сустракаецца з рознымі людзьмі, яму ёсць пра што паведаміць чытачу.

Матыў «дарогі» досыць распаўсюджаны ў нацыянальнай літаратуры, пачынаючы з яе вытокаў — М. Гусоўскі, Я. Баршчэўскі, і заканчваючы класікамі — К. Чорны В. Быкаў, Б. Сачанка і інш. «Сустрэчы на дарогах» — такое вызначэнне характэрна і для ўсёй творчасці І. Чыгрынава. Гэта, як лічыць Т. Грамадчанка, «звязана з біяграфіяй пісьменніка — у маладыя гады І. Чыгрынаў любіў пешыя падарожжы па роднай зямлі»[3].

Проза пісьменнікаў філалагічнага пакалення мела тэндэнцыю да эмацыянальнага ўспрымання рэчаіснасці (М. Стральцоў, Я. Сіпакоў і пэўным чынам В. Адамчык, І. Пташнікаў, У. Караткевіч і інш.). І. Чыгрынаў з самага пачатку сваёй творчасці імкнуўся да пісьма аб'ектываванага.

Асаблівасцю «тэхнікі» чыгрынаўскага апавядання, пры ўсёй шматграннасці яго жанравых форм, з'яўляецца тое, што яно, апавяданне, нясе на сабе той адметны характар аўтарскай суб'ектыўнасці, у якой няма месца «споведзі», ці, кажучы словамі Д. Бугаёва, «лабавой дэкларацыі»[4]. Суб'ектыўнасць прысутнічае ў неразгорнутым, ледзь прыкметным выглядзе — у інтанацыі, у адценні, у рытме, у пафасе, што надае аб'ектыўнаму малюнку непаўторнасць аўтарскага вырашэння.

У сваіх апавяданнях І. Чыгрынаў імкнуўся адлюстраваць індывідуальны высокі дух як канкрэтную форму праяўлення народнага высокага духу. Духу нацыянальнага. Стыль пісьменніка на самым пачатку меў адметную якасць — грунтаваўся на ідэі народнасці ў адлюстраванні характараў.

З цягам часу ягоная проза набудзе новыя якасці — эпічную глыбіню ў адлюстраванні «масавага быту» (Я. Эльсберг). Усё гэта, натуральна, прывяло да разбурэння жанравых форм апавядання, патрабавалася іншая, больш ёмістая, больш маштабная жанравая форма — форма рамана.

Ужо ў творчай манеры кароткіх апавяданняў бачылася адзінства народных галасоў, што надавала ім, апавяданням, «харавое» гучанне. Гэта і вызначала асаблівасць чыгрынаўскага стылю. Сам пісьменнік паняцце эпапеі непасрэдна звязваў з паняццем народнасці. Эпапея, на думку І. Чыгрынава, «гэта народ... каб паказаць народ, каб паказаць такія вялікія падзеі, як рэвалюцыя, вайна, патрэбны вялікія формы»[5].

## Плача перапёлка, плача, але не здаецца народ

Вызначаючы ролю народа ў якасці галоўнай гістарычнай сілы, празаік імкнуўся да разгорнутага выказвання калектыўнай думкі. Гэтаму садзейнічала і тэма, якая ўсё больш прыцягвала да сябе пісьменніка,— тэма Вялікай Айчыннай вайны.

Ён стварыў раманы, якія сталі адметнай з'явай у гісторыі беларускай літаратуры,— «Плач перапёлкі», «Апраўданне крыві», «Свае і чужынцы», «Вяртанне да віны», «Не ўсе мы згінем».

**Анатоль КЛЫШКА, Янка СІПАКОЎ, Іван ЧЫГРЫНАЎ, Арсень АСТРОЎСКІ (Масква, 1971 г.).**





**Цудоўны настрой. Іван МЕЛЕЖ і Іван ЧЫГРЫНАЎ. 1972.**

І. Чыгрынаў звяртаецца да першых месяцаў вайны — найбольш складанага, найбольш супярэчлівага перыяду. І найбольш трагічнага. Першая кніга пенталогіі «Плач перапёлкі» — раман унікальны па глыбіні адлюстравання псіхалагічнага стану людзей напярэдадні акупацыі. Тое, што адбываецца ў Верамейках і акрузе, праходзіла праз масавую свядомасць і адлюстроўваецца ў плыні думак герояў.

Трывожным чаканнем, здаецца, напоўнена ўсё наваколле, зацiхла і напружылася нават сама прырода. І толькі плач перапёлкі парушае начную цішыню, вярэдзіць і без таго ўзрушаныя душы верамейкаўцаў. Гэта плача сама зямля беларуская. Трывожна і няўцешна. «Калі птушкі так плачуць са свайго гора, то як жа тады павінны галасіць людзі, у якіх гора бывае наогул незраўнана больш, а цяпер дык і зусім цераз край»,— з горыччу адзначыць Дзяніс Зазыба.

І. Чыгрынаў адзін з першых у беларускай пасляваеннай прозе адлюстраваў трагедыю жыцця мірнага насельніцтва, якое апынулся на акупаванай немцамі тэрыторыі. І трэба было, каб выжыць, насуперак усяму сеяць хлеб, кахаць і нараджаць дзяцей. Вось у гэтым процістаянні спрадвечна вясковага, спрадвечна чалавечага і разбуральнага заключаны найбольшы трагізм «жыцця ў вайне».

Менавіта самасвядомасць народа, беларускага народа, выступае ў раманах «Плач перапёлкі», «Апраўданне крыві» як суб'ект пазнання. Яна ж становіцца істотным формаўтваральным пачаткам, які арганізуе кампазіцыю твора, яго стылёвую структуру і моўныя формы.

У «Плачы перапёлкі» пісьменнік імкнецца да ўнутрана аднароднай апавядальнай структуры, якая сваім моўным каларытам зближаецца з народнай апавядальнай манерай. На аснове спалучэння дзвюх моўных стыхій — народнай і літаратурнай — узнікаюць вобразная глыбіня аповеду і яго эмацыянальная энергія.

Падзейнае дзеянне ў першых дзвюх кнігах пенталогіі перадаецца галоўным чынам праз свядомасць народа з дапамогай «галасоў» дзеючых асоб, што стварае эфект народнага шматгалосся. У рамане «Плач перапёлкі» шматгалоссе мае два структурныя цэнтры — дыялагічны і харавы. Дыялагічны цэнтр амаль заўсёды выяўляе палеміку (Дзяніс Зазыба і Чубар, Зазыба-бацька і Зазыба-сын, Дзяніс Зазыба і Кузьма Прыбыткоў), стракатасць пазіцый персанажаў, якая даходзіць да палярнасці (Дзяніс Зазыба і Брава-Жыватоўскі).

З дапамогай харавога прынцыпу паказу ствараецца зборны вобраз народа, вобраз калектыўнага героя. Адлюстраванне «хору» галасоў разам з дыялагічным апавяданнем даюць магчымасць аўтару максімальна разнастаіць жыццёвы матэрыял.

Дамінацыя ўнутранага дзеяння, псіхалагічная актыўнасць герояў дазволілі аўтару засяродзіцца на выяўленні скрытага вытоку, дзеянняў фізічных. Адсюль і своеасаблівасць кампазіцыйнай пабудовы. Даследчык А. Яскевіч вызначыў яе як «рад супастаўленняў, дэталяў, сцэн, эпізодаў», які, «суіснуючы разам з дзеяннем псіхалагічным, раскрывае ідэйную дамінанту твора»[6].

Такім чынам, І. Чыгрынаў глядзеў на свайго героя не столькі «звонку», фіксуючы яго кожны рух, жэст, рэпліку, колькі «знутры». У гэтай сувязі яго цікавіла і тая сфера жыцця, што фармавала светаўспрыманне героя, яго духоўныя і маральныя погляды.

Да ўсяго, аўтар не вылучаў падзей і дзеючых асоб «з агульнай плыні жыцця», яны — арганічная частка гэтай плыні. Яго герояў, верамейкаўцаў, проста нельга ўявіць без канкрэтнага асяродка, без гістарычна сфармаванага ўкладу працоўных, сямейных і нават суседскіх адносін. Адсюль і «татальная» дэталізацыя, аўтар уводзіць аб'ёмныя экскурсы ў гісторыю сяла, вуліцы, піша нават гісторыю бабінавіцкай царквы, стварае «гісторыю» пня, які стаіць у лесе. І г. д. Праз гэта проза пісьменніка набывае рысы дакументальнага пісьма, і па меры развіцця дзеяння роля дакумента будзе ўзрастаць. Апавяданне па форме становіцца блізкім да самога жыцця.



**З Кастусём КІРЭНКАМ. 1973.**

## Два ідэйна-маральныя полюсы

Раманная творчасць І. Чыгрынава — гэта грунтоўна выпісаныя характары беларускага сялянства. Характары-тыпы. Галоўныя героі тут субстанцыянальныя, яны выступаюць прадстаўнікамі сваёй нацыі, народа. Жыццёвы шлях Дзяніса Зазыбы, Парфена Вяршкова, Кузьмы Прыбыткова суаднесены з дынамікай нацыянальнага жыцця — трагічнага ў сваім гістарычным развіцці.

Дзяніс Зазыба — тыповы прадстаўнік сялянскіх мас, ён увабраў у сябе лепшыя якасці народнага характару, яго мудрасць і разважлівасць. Тагачасная крытыка адзначала наватарскае вырашэнне гэтага вобраза. С. Андраюк назваў яго «якасна новым тыпам чалавека з народа»[7]. Але разам з тым герой быў і сынам свайго часу. Сам пісьменнік пісаў: «Як чалавек Зазыба быў з мудрэйшых... але і ён яшчэ не здольны быў угадаць наперадзе таго крывавага замарачэння, якое праз год, паўтара звядзе са свету вялікую частку ягонага народа... Для многіх аказалася, што забіць чалавека — няцяжка!»

Развіццё вобраза Зазыбы ў першых кнігах пенталогіі ідзе паралельна вобразу Чубара. Героі разведзены на розныя ідэйна-маральныя полюсы. Іх адносіны зводзяцца да супрацьстаяння і адштурхоўвання, але адначасова ідзе складана-супярэчлівы працэс «прыцяжэння» Чубара да Зазыбы. Канфлікт, які ўзнікае паміж Зазыбам і Чубарам у пачатку рамана «Плач перапёлкі», скончыцца поўным паражэннем Чубара ў рамане «Апраўданне крыві». У «Сваіх і чужынцах» пачнецца адраджэнне Чубара, паступова ён будзе пазбаўляцца ад просталінейнасці, ад уплыву «дырэктыў», пачнецца павольнае вяртанне героя да людзей, да разумення іх трывог і турбот. У «Вяртанні да віны» Радзівон Чубар гіне. Гіне, баронячы годнасць не партыйца, а чалавека, патрыёта сваёй зямлі. Менавіта з вобразам Чубара, з яго маральным «уваскрэсеннем» звязана і назва рамана — «Вяртанне да віны».

Вобраз Чубара ў кантэксце іншых персанажаў цыкла найбольш пазначаны ідэалогіяй і мараллю свайго часу. Ён адзін з самых трагічных герояў пенталогіі — праз увасобленыя ў ім трагічныя супярэчнасці жыцця таго пакалення, прадстаўніком якога ён быў.

Дзяніс Зазыба таксама выхаваны рэвалюцыяй. Вернасць ідэалам камунізму была выпакутавана ўсім яго жыццём. Для Зазыбы савецкая ўлада, гэта як дзіця для маці. Ніводная маці не хоча, каб дзіця ў яе было кепскае. «Вось так і для мяне савецкая ўлада! — даводзіць ён сыну Масею.— Я яе таксама... ну, калі хочаш ведаць, я яе таксама раджаў!.. Я за яе біўся! Я за яе пакутаваў». Але было ў характары Зазыбы і іншае — тыпова сялянскае і нацыянальнае. Ён быў абачлівы, непаспешлівы ў прыняцці рашэнняў. Яму неабходна было ва ўсім разабрацца самастойна, да ўсяго даўмецца сваім розумам.

Вайна ўнесла разлад у, здавалася б, непахісныя перакананні Зазыбы. Рушыўся свет, рушыліся ідэалы героя. Партызанская барацьба набывае супярэчлівыя формы. У Зазыбы ўзнікае думка пра заложніцтва «ўсяго народа, які падпаў пад акупацыю. Пры такім заложніцтве ахвяры могуць быць незлічонымі». І ён становіцца сведкам гэтых ахвяр: гінуць сем'і партызан і паліцаяў, палаюць цэлыя вёскі. Вайна запатрабавала ахвяр і ад самога Зазыбы — ад рук невядомага партызана прыняла пакутніцкую смерць яго жонка Марфа Давыдаўна, сын Масей апынуўся на чужыне і — перад самым вызваленнем былі спалены Верамейкі...

## Трансфармацыя свядомасці

Пенталогія, якой І. Чыгрынаў аддаў амаль тры дзесяцігоддзі, заканчваецца знакамітым партызанскім парадам у Мінску, што адбыўся ў 1944 г. Змены ў краіне ў 80—90-я гады не маглі не паўплываць на вырашэнне тэмы вайны і вобраза Зазыбы. Пра гэта яскрава сведчыць апошні раман «Не ўсе мы згінем», пазначаны больш цеснай сувяззю гісторыі і дня сённяшняга. Цяпер пісьменнік на падзеі вайны і чалавека на вайне, ці, дакладней, у вайне, глядзіць са светапоглядных пазіцый канца XX ст.

Дзяніс Зазыба, як былы партызан, атрымаў ад раённага кіраўніцтва заданне адвесці ў Крычаў у вайсковую пральню «змабілізаваных мясцовых дзевак». Было лета 1944 г. Там, у горадзе, і адбылася сустрэча Дзяніса Яўменавіча з былым камроты дывізіі Шчорса Пракопам Зеленадомскім, цяпер генералам. Генерал меў заданне адбіраць у армію новых байцоў з ліку партызан і былых паліцэйскіх, апошніх у штрафроты. Зеленадомскі запрасіў Зазыбу служыць да сябе ў якасці кансультанта, «спецыяліста па нядаўняй акупацыі». Але гэта фармальна. У сапраўднасці Зазыба спатрэбіўся генералу «па роднасці душаў, па выхаванні высокай маралі першых гадоў бальшавіцкай рэвалюцыі, акурат генерал бачыў цяпер у сваім колішнім кулямётчыку пейкае апраўданне сябе». У той час, як Зазыба «хаваўся ў генералавай камандзе ад той пустэчы, якая ўтварылася ў душы пасля смерці Марфы Давыдаўны і знікнення Масея».

Але найбольшую патрэбу ў такім «дуэце» меў сам аўтар. Ён зводзіць разам двух былых змагароў за савецкую ўладу, каб праз бясконцыя дыялогі ставіць і абмяркоўваць разнастайныя пытанні вайны і міру. Найперш пісьменніка цікавяць праблемы партызанскага руху на пачатку вайны, яго сутнасць і вынікі, а таксама праблемы здрадніцтва і яго вытокаў, вяртаецца ён і ў сумна вядомыя яжоўска-берыеўскія часы, і нават яшчэ далей — у часы калектывізацыі.

Гэтыя дыялогі «прасякнуты» інфармацыяй сённяшняга дня. «А табе не здаецца, таварыш генерал,— звяртаецца Зазыба да свайго старога сябра,— што ёсць пэўнае падабенства паміж апалчэнцамі сорак першага года і цяперашнімі мабілізаванымі? Прынамсі, падыход адзін і той жа да іх — моў, гаці, высцілай масты партызанамі?» Так гаворыць былы камуніст, які прайшоў праз трагедыю вайны, спасцігнуў яе горкую праўду, але ўсёй праўды чалавек «з народа» тады ведаць яшчэ не мог.

Спачатку Дзяніс Зазыба («Плач перапёлкі») не прыняў душою асуджанага ўладамі сына Масея, бо адданасць партыі дамінавала над бацькоўскімі пачуццямі. Пазней («Вяртанне да віны») ён спакойна паставіцца да Масеевай службы валасным пісарам у Бабінавічах.

У рамане «Не ўсе мы згінем» ужо вялікі душэўны боль і трывога кіруюць учынкамі Зазыбы, ён сам ладзіць схованку для сына на гарышчы, бароніць яго не ад немцаў, а ад сваіх — партызан: «Які цяпер суд?.. Цяпер не суд бывае, а скорая расправа. Я нагледзеўся ўжо на норавы і немцаў і нашых. Добра яшчэ дачакаюцца выслухаць, а то проста... адвядуць у кусты і шлёпнуць». Не абвінавачвае Зазыба сына і тады, калі той напрыканцы вайны кіруецца на чужыну. Зазыба адчувае віну перад сынам, за тое, што не мог зразумець яго раней.

Такім чынам, у апошняй кніжцы цыкла складаныя, супярэчлівыя адносіны Дзяніса Зазыбы і Масея, адносіны адштурхоўвання і прыцяжэння, набылі пэўную выразнасць. Дзяніс, нарэшце, зразумеў унутраную драму сына. Зразумеў яго душу, не заплямленую калабарацыянізмам.

Трансфармацыя свядомасці Дзяніса Зазыбы адбывалася паступова, але няўмольна. Страта сям'і паставіла апошнюю кропку ў гэтым працэсе: «Як сям'ю страціў, адчуў штосьці іпакшае. Ва ўсялякім выпадку, душа зрабілася акурат другой.



**Прыемна паслухаць Аркадзя Куляшова. 1976.**

Нават не да ўсяго ўспрымальнай. У кожным разе, разборлівай». У героя адбылася пераацэнка каштоўнасцей у выніку набытага рэальнага вопыту жыцця на вайне. Дзяніс Зазыба ў кнізе «Не ўсе мы згінем» інакшы, у параўнанні з тым, якім ён быў у рамане «Плач перапёлкі». Ідэйна інакшы. Маральна інакшы. Хоць пры гэтым ён не адмаўляецца ад ідэалаў і прынцыпаў сацыялізму. Знік максімалізм. Значна паглыбілася гуманістычная арыентацыя героя. Асабліва балючымі былі для Зазыбы ўспаміны пра верамейкаўцаў, якія сталі не столькі ахвярамі вайны, колькі чалавечай жорсткасці, калі партызаны дзяліліся на сваіх і чужых, і тым чужым, прышлым, не было ніякай справы да мясцовых людзей, аднак «найболей за ўсё яму стала шкада Верамеек, знявечаных і загнаных пад зямлю».

Апошняя кніжка пенталогіі сведчыць пра тое, што проза І. Чыгрынава набыла вопыт крытычнага рэалізму, вопыт інтэлектуальна-палітычнай літаратуры. У ёй ладараць, нароўні з характарам, думка, разважанне, аналіз.

## Спасціжэнне жыцця... і смерці

Заслуга Чыгрынава-мастака ў тым, што ён здолеў паказаць беларускую вёску на ўзроўні складана-глыбокай псіхалагічнай барацьбы-процістаяння розных светаўспрыманняў, розных маральных арыенціраў, і яшчэ ў большай ступені — на ўзроўні паэтычнай цэласнасці вясковага быцця. Пенталогія перадае адчуванне эпічнай прасторы. Апавяданне выходзіць за межы адназначных процістаянняў і рухаецца магутна, шматслойна. Яно асветлена вялікай ідэяй — спрадвечнай любоўю селяніна да зямлі, да роднага кута, які ў І. Чыгрынава меў назву Верамейкі. У кругазварот гэтага агульнага жыцця ўцягнуты ўсе персанажы — ад нованароджанага дзіцяці да безнадзейна хворага мужчыны ў адной з падбеседскіх вёсак.

Самабытнасць форм выяўлення агульначалавечага ў яго нацыянальнай рэальнасці і канкрэтна-індывідуальным увасабленні пакладзена ў аснову многіх вобразаў пенталогіі, але найбольшай ступені свайго выяўлення яна дасягнула ў вобразе Дзяніса Зазыбы, Парфена Вяршкова і іншых верамейкаўскіх жыхароў, уключаючы і яркія пластычна выпісаныя вобразы жанчын.

Увогуле для І. Чыгрынава жыццё вёскі цікава найбольш у плане чалавеказнаўчым. Як было гэта цікава аўтарам «Новай зямлі», «Млечнага шляху», «Палескай хронікі». Менавіта гэта і дазволіла пісьменнікам адлюстраваць як найглыбей духоўныя патэнцыі свайго народа. У І. Чыгрынава яны яшчэ асацыіруюцца з вызначэннем патрыятызму. «Што такое патрыятызм? — разважае ў адным са сваіх інтэрв'ю І. Чыгрынаў.— Некаторым... здаецца, што патрыятызм — гэта калі выйшаў на вуліцу і крыкнуў "ура!". Не, патрыятызм у час вайны, асабліва ў час акупацыі,— гэта зусім іншае. Патрыятызм — гэта духоўны свет народа. І вось як разумее патрыятызм народ, так і я намагаўся адлюстраваць гэта ў сваіх раманах»[8].

У свой час было выказана нямала папрокаў пісьменніку за празмерную дэталізацыю «геаграфіі», прыроднага свету. І, пэўна, не без падставы. Але калі мець на ўвазе іх функцыянальнае значэнне, то ў І. Чыгрынава прырода, удакладняючы абставі-

ны дзеі, азначае яшчэ і рух часу, змену дня і ночы, сонца і непагоды. У апавядальнай структуры чыгрынаўскіх раманаў пейзаж мае як бы свабоднае і «нематываванае» значэнне. Але ў той жа час нельга не бачыць яго падпарадкаванасці аўтарскай канцэпцыі. Ён нясе ў сабе ідэю бясконцасці жыцця — жыцця, нязгаснага ў часе і прасторы. Навакольны свет, прыхаваны ў няяркай, з прыкметамі затухання, восеньскай прыродзе, уключаецца ў эпічную канву апавядання і з'яўляецца асаблівай паралеллю жыццю чалавека. Палкае жаданне выжыць у маленькага ласяняці, вернасць звычаю старой бусліхі, якая пасля гібелі буслянят па-ранейшаму стаіць у гняздзе, жыватворнасць крынічкі каля Верамеек,— усё гэта знітоўваецца ў агульны матыў невынішчальнасці і моцы ўсяго жывога на зямлі.

Раманы І. Чыгрынава прасякнуты глыбокай філасофскай думкай. Хоць пры гэтым філасофскае нідзе не праяўляецца ў адкрытай, «самагоднай» форме. Яно цесна звязана з канкрэтным і асобна ад носьбіта не існуе: Зазыба-старэйшы «філасофствуе» ў дыялогах з Чубарам, Масеем, Кузьмой Прыбытковым, Брава-Жыватоўскім, зусім не думаючы пра гэта. Філасофія для яго не мае абстрактнага гучання, яна канкрэтная. Гэта — само жыццё. Гэтак жа «будзённа» разважае пра дабро і зло, жыццё і смерць Парфен Вяршкоў.

Адчуваючы блізкую смерць, Парфен стараецца спасцігнуць сэнс жыцця, разабрацца ў прызначэнні чалавека на зямлі. Бо толькі ён зможа зразумець і сваё жыццё, даць яму апраўданне. Праз вобраз старога Парфена пісьменнік наблізіцца да хрысціянскага разумення жыцця і смерці.

Мастацкі свет І. Чыгрынава — гэта адначасова і свет асобнага чалавека, і свет народа, і свет прыроды. Гэты мастацкі свет адрозніваецца сінтэтычнасцю, адзінствам індывідуальна-канкрэтнага з агульнанацыянальным і агульначалавечым. Сувязь аўтарскага голасу з голасам персанажа, які прадстаўляе народнае светаразуменне, вызначае тое мастацкае адзінства форм, якое сведчыць пра асабліва высокі ўзровень стылёвага сінтэзу, дасягнуты пісьменнікам у жанры эпічнага рамана.

Гаворачы пра чыгрынаўскую ваенную прозу, В. Каваленка адзначыў, што «імкненне пісьменніка да эпапейнай задумы ў адлюстраванні першапачатковага перыяду зараджэння народнага супраціўлення ворагу выражае традыцыйную нацыянальную тэндэнцыю ў развіцці беларускай прозы на тэму вайны, яе ўнутрана-эстэтычную арыентацыю, якая прадыктавана спецыфічнымі ўмовамі народнага лёсу»[9].

У 80-я гады І. Чыгрынаў пачаў працаваць яшчэ і ў галіне драматургіі. Першыя яго п'есы былі створаны на аснове раманаў і апавяданняў («Плач перапёлкі» — пастаўлена ў 1980, «Апраўданне крыві» — пастаўлена ў 1984, «Дзівак з Ганчарнай вуліцы» — пастаўлена ў 1986). У п'есе «Чалавек з мядзведжым тварам» пісьменнік звяртаецца да праблем сучаснага жыцця, палітычныя падзеі пачатку другой сусветнай вайны адлюстраваны ў п'есе «Ігракі». Цікавіць І. Чыгрынава і гістарычная тэма: «Звон — не малітва» (пра Полацкае княства часоў Рагнеды і Усяслава), «Следчая справа Вашчылы» (Крычаўскае паўстанне 1743—1744 гг.).

Пісьменнік адметнага індывідуальнага таленту, празаік з эпічным ахопам жыцця і з адзінай мерай ацэнкі з'яў — з пазіцыі народнага светаадчування, народнага светабачання. І. Чыгрынаў пакінуў яркі след у развіцці нацыянальнай рэалістычнай літаратуры.

ЛІТАРАТУРА


[1] Ч ы г р ы н а ў І. Самы шчаслівы чалавек. Мн., 1967. С. 188—189.
[2] Літаратура і мастацтва. 1979, 29 чэрвеня.
[3] Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя. У 4-х т. Т. 4, кн. І. Мн., 2002. С. 558.
[4] Б у г а ё ў Д. Шматграннасць. Мн., 1970. С. 142.
[5] Літаратура і мастацтва. 1979, 29 чэрвеня.
[6] Я с к е в і ч А. Кампазіцыя твора. // Маладосць. 1977, № 6. С. 24.
[7] А н д р а ю к С. Жыць чалавекам. Мн., 1983. С. 65.
[8] Літаратура і мастацтва. 1979, 29 чэрвеня.
[9] К о в а л е н к о В. Общность судеб и сердец. Мн., 1985. С. 90—91.


**Фота Уладзіміра КРУКА**